# *КАМПЕТЭНТНАСЦЬ АСОБАСНАГА УДАСКАНАЛЬВАННЯ*



*Развіццё грамадства, сучаснай навукі, высокіх тэхналогій, увядзенне ў навучальны працэс новых прадметаў навучання патрабуюць ад нас, педагогаў, новага падыходу да дасягнення пастаўленых мэт у навучанні навучэнцаў.*

*Школа павінна ствараць умовы для фарміравання асобы, якая валодае такімі кампетэнцыямі.*



***Удасканальвацца – гэта значыць станавіцца лепш, сучасней. Таму ўдасканаленне – мэта жыццядзейнасці чалавека. Усё гэта я і спрабую данесці да сваіх вучняў.***

***У любой дзейнасці можна вылучыць два бакі – адаптыўны (ўмець прыстасоўвацца да зменлівых вонкавых умоў) і творчы (стваральны). Творчы з'яўляецца вызначальным у працэсе ўдасканалення.***



*Каб заахвоціць школьнікаў да самаўдасканалення, а далей развіць ўсвядомленую патрэбу ў самаўдасканаленні, выкарыстоўваюць розныя формы класнай (ўрочнай) і пазакласнай дзейнасці. Выкарыстоўваюцца як новыя тэхналогіі, так і традыцыйныя формы навучання і выхавання. Найбольш паспяховымі, на мой погляд, з'яўляюцца тэхналогіі, звязаныя з рознымі формамі інтэрактыўнага навучання, праектнай дзейнасцю, нестандартнымі ўрокамі, інтэграванымі ўрокамі.*



***Перавага аддаецца таксама актыўным формам работы, і ў першую чаргу – творчай дзейнасці навучэнцаў. Адным з відаў творчых работ з'яўляюцца прэзентацыі, паведамленні, рэфераты. Такія віды дзейнасці вучаць дзяцей разважаць, лагічна і паслядоўна выкладаць свае думкі, выкарыстоўваць сродкі выразнасці, даносіць асноўную думку сваёй творчай працы.***



***Глыбіня, яснасць, нестандартнасць вобразнага мыслення, свабода маўленчага самавыяўлення, багацце творчага ўяўлення, трываласць і аператыўнасць ўсіх відаў памяці, дапытлівасць, імкненне пастаянна аперыраваць ведамі з розных вобласцей, здольнасць да здзіўлення, захаплення, летуценнасць, інтэлектуальная разняволенасць, нарэшце, адоранасць – усе гэтыя якасці трэба абудзіць, рэалізаваць, удасканальваць у вучняў.***



*XXI век … Нягледзячы на новыя сучасныя тэхналогіі, на ўсеагульную камп'ютарызацыю, на чале ўсяго па-ранейшаму стаіць чалавек. Усё ў далейшым будзе залежаць ад яго, зараз яшчэ дзіця, але ўжо чалавека новага стагоддзя.*

# ДЗЯКУЙ ЗА ЎВАГУ